■ Парламенцкі дзённік

Галоўнае — узаемны давер

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся са Спецкаардынатарам АБСЕ на парламенцкіх выбарах у нашай краіне

Важна, каб усё праходзіла ў ключы даверу, узаемапаразумення. На гэтым зрабіў акцэнт Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, падчас размовы з Кентам ХАРСТЭДАМ, намеснікам старшыні Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецыі і супрацоўніцтве ў Еўропе, спецыяльным каардынатарам АБСЕ на парламенцкіх выбарах у Беларусі.

Фота БЕЛТА.

— Ужо амаль 25 гадоў як Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка напачатку сустрэчы. — Наша краіна працавала вельмі ініцыятыўна і зрабіла вялікі ўнёсак у справу ўмацавання агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва, у справу бяспекі. Актыўна працавалі беларускія дэпутаты — асабліва на працягу апошніх гадоў. Ініцыяваны шэраг рэзалюцый, якія былі прыняты на сесіях Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Спікер ніжняй палаты звярнуў увагу на той факт, што прадуктыўнай для Беларусі была апошняя сесія ПА АБСЕ, якая праходзіла ў Грузіі. Тады пастаянным камітэтам Парламенцкай асамблеі аднагалосна было прынята рашэнне аб правядзенні 26-й сесіі ПА АБСЕ ў Мінску ў наступным годзе — з 5 па 9 ліпеня. Уладзімір Андрэйчанка запэўніў, што беларускі бок зробіць усё неабходнае, каб гэтая сесія прайшла на годным узроўні.

Гаворачы пра ход парламенцкай выбарчай кампаніі ў нашай краіне, Уладзімір Андрэйчанка паведаміў, што тыдзень таму ён сустрэўся з папярэдняй місіяй назіральнікаў ад Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы.

— Мы дамовіліся паслядоўна рухацца насустрач адзін аднаму, абмяркоўваць тыя пытанні, праблемы, што ўзнікаюць, — сказаў спікер ніжняй палаты парламента. — Самае галоўнае, каб усё гэта праходзіла ў ключы даверу, узаемапаразумення.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што ўжо пачаўся агітацыйны перыяд выбарчай кампаніі.

— Думаю, што канкурэнцыя ў нас будзе праходзіць вельмі сур'ёзная, і, відаць, прынцыпова важна, каб палітычная канкурэнцыя праходзіла ў рамках нашага заканадаўства, каб яна праходзіла канструктыўна, — заявіў ён. — Нельга дапусціць, каб падвяргаліся сумненням такія каштоўнасці, як мір, парадак, законнасць. Думаю, што гэта павінна стаць аксіёмай для ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу, бо вынік безадказнасці ў палітыцы мы бачым на прыкладах асобных краін.

Кент Харстэд прызнаўся, што яму камфортна знаходзіцца ў Беларусі.

— Тут прыемная атмасфера, нам заўсёды прыемна працаваць з вашымі калегамі, — сказаў ён. — Летась я знаходзіўся тут у ролі каардынатара, назіраючы за прэзідэнцкімі выбарамі. Гэта вельмі незвычайная з'ява, калі адзін і той жа чалавек з'яўляецца спецыяльным каардынатарам на другіх выбарах запар у адной краіне на працягу аднаго года. Лічу, што, хутчэй за ўсё, гэта ўнікальная падзея, калі адзін чалавек мае такую магчымасць. Я рады, што быў назначаны на гэтую ролю, і думаю, што апраўдаю спадзяванні.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Рэпарцёр атрымаў заданне...

АДРАМАНТАВАЦЬ АНТЭНУ Ў ВЁСЦЫ

ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЯЕ ПАШКОДЗІЛА НАВАЛЬНІЦАЙ

Дача, як вядома, тое месца, дзе дажываюць свой век старыя рэчы. Вось і наш добры яшчэ тэлевізар «Віцязь» амаль два гады таму перамясціўся ў вясковы дом, які набылі ў якасці дачы ў Камянецкім раёне. А пасля пераходу на лічбавае тэлевяшчанне, давялося набываць прыстаўку да тэлевізара. Так, дарэчы, зрабілі амаль усе суседзі, пастаянныя жыхары вёскі. Яны ж і параілі звярнуцца да тэлевізійнага майстра, які працуе ў Высокім, бліжэйшым горадзе, што раней быў раённым цэнтрам.



Майстар прыехаў па выкліку даволі аператыўна, праз дзень ці два. Ён меў пры сабе ўвесь неабходны набор апаратуры, прывёз сваю прыстаўку з блокам сілкавання і пультам. І літаральна праз паўгадзіны лічбавае вяшчанне было настроена. Акрамя асноўных нашых каналаў, стала магчыма выбіраць для прагляду з двух дзясяткаў каналаў польскага тэлебачання. Мяжа з суседняй краінай праходзіць на адлегласці менш за дзесяць кіламетраў, таму нашы прыёмнікі з лёгкасцю ловяць іх трансляцыю.

Летась усё было добра, але ў канцы восені пачаліся нейкія непаладкі з тэлебачаннем. Тэлевізар уключаўся, што называецца, цераз раз. Зімой мы ў вёску не ездзілі, а вясной успомнілі пра тэлебачанне, вырашылі адрамантаваць. Сусед падказаў, што, магчыма, трэба замяніць блок сілкавання антэны. У яго так было пасля адной з навальніц. Замена невялікай дэталі коштам у 40 тысяч старых рублёў дала, што называецца, станоўчы эфект. Па вечарах мы маглі глядзець навіны і іншыя тэлеперадачы. Але нядоўга. У адзін з прыездаў тэлевізар, што называецца, адмовіўся працаваць, і пры ўключэнні на ім з'яўлялася дзяжурная таблічка са словамі «Нет сигнала». Наш тэлевізар спрабавалі настроіць сябры, суседзі, якія лічаць сябе хоць колькінебудзь знаўцамі, але разводзілі рукамі. «Няма сігналу і не будзе», — пажартаваў муж і наступным разам прыхапіў з сабой на дачу некалькі кніг.

Я паспрабавала патэлефанаваць майстру, які працаваў у нас і пакінуў свае рэквізіты. Гэтым разам ён быў не такі прыветлівы, як упершыню. Сказаў, што па выкліку не паедзе, бо яму гэта нявыгадна: «Магчыма, у вас збілася настройка прыстаўкі, там усяго работы — націснуць на дзве кнопкі. Вязіце самі ў Высокае, тут і пагляджу. А калі справа ў антэне, то антэнамі я не займаюся». Я паспрабавала націснуць на свядомасць, папытаць, што рабіць, калі такая праблема ўзнікне ў пенсіянера, які не мае транспарту. Але прыватны прадпрымальнік слухаць мае сацыяльныя разважанні не стаў, паклаў трубку.

Тады мы вырашылі забраць прыстаўку ў Брэст, паказаць у тэлевізійнай майстэрні. Добразычлівая дзяўчына па тэлефоне падрабязна расказала пра тарыфы іх паслуг: 150 тысяч за дыягностыку, калі спатрэбіцца замена дэталяў, яшчэ тысяч сто (старымі грашыма). Тады ўжо падумвалі, што не варта траціцца на рамонт, лепш набыць новую. Але муж усё-такі аднёс прыстаўку па ўказаным адрасе. Майстар уключыў прыбор у разетку і ўсміхнуўся: «Яна ў вас поўнасцю спраўная, рамантаваць тут няма чаго, праверце антэну».

Прыехалі зноў у вёску са сваёй прыстаўкай, а звяртацца з нагоды антэны тут няма да каго. Тэлевізійны майстар сказаў пра гэта яшчэ раней. Трэба было думаць, дзе набываць новую антэну, як яе ўстанаўліваць. Цікава, што «талеркі», якія тырчаць са сцен многіх вясковых дамоў, беларускія каналы не ловяць. Пра гэта паведамілі суседзі. І адзін з іх выказаў прапанову звярнуцца да ўмельца, які жыве ў суседняй вёсцы.

Анатоля Паўлавіча ведае ўся округа. Раней ён працаваў электрыкам, а пасля выхаду на пенсію займаецца толькі сваім агародам ды хатняй гаспадаркай. Але ўсе, у каго здараецца паломка ўласнага аўтамабіля, пральнай машыны ці халадзільніка, абавязкова ідуць да Паўлавіча, бо ён умее ўсё. Анатоль Паўлавіч прыбыў праз гадзіну на сваім матацыкле. Ён папрасіў вялікую лесвіцу, забраўся наверх, зняў замацаваную на жардзіне антэну і канстатаваў: ад навальніцы згарэла плата. У яго шэрым чамаданчыку такая дэталь знайшлася, і Анатоль Паўлавіч яе паспяхова замяніў. Праз нейкія паўгадзіны на тэлепрыёмніку паявіўся сігнал і сталі мільгаць каналы.

Такім чынам нам давялося заплаціць за плату і прыплюсаваць невялікі ганарар майстру, суму якога ён ніколі не называе сам, маўляў, дасце, колькі палічыце патрэбным. І вельмі шкада, што вось такія вясковыя ўмельцы, людзі з галавой і залатымі рукамі, не становяцца прадпрымальнікамі, не рэкламуюць свае паслугі і не аказваюць іх. Таму што бытавому абслугоўванню невялічкага гарадка Высокае вельмі не хапае здаровай канкурэнцыі.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

С 17.09.2016 устанавливается по ранее открытым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:
- **«Премиально-накопительный «Детский»**, открытым до 13.11.2015, ставка основных процентов в размере 15,5% годовых;
- **Накопительный** (накопительный вклад в национальной валюте с ежемесячной капитализацией; накопительный вклад в белорусских рублях; срочный банковский накопительный вклад в белорусских рублях, а также накопительные вклады, введенные согласно Приказу Государственного банка СССР от 29.03.1990 №30 «О введении новых видов вкладов в учреждениях Сберегательного банка СССР»), процентная ставка в размере 16% годовых;

Установленный размер процентов применяется только к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность и автоматическое перезаключение которых на новый срок произошло до 01.04.2016.

С 17.09.2016 устанавливается по ранее открытым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:
- **«Четыре сезона»,** ставка основных процентов в размере 12% годовых.
- **«Классик безотзывный Новый»,** процентные ставки в следующих размерах:
на срок 6 месяцев – 17% годовых;
на срок 9 месяцев – 18,5% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

С 17.09.2016 устанавливается по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Интернет-депозит – Тренд»**:
- открытым до 13.11.2015 – ставка основных процентов при фактическом ежедневном остатке вклада до 2000,00 рублей (включительно) в размере:
14,5% годовых по вкладам со сроком хранения 12 месяцев;
15,5% годовых по вкладам со сроком хранения 18, 24 и 36 месяцев;
- открытым до 13.11.2015 – ставка основных процентов при фактическом ежедневном остатке вклада свыше 2000,00 рублей в размере:
15% годовых по вкладам со сроком хранения 12 месяцев;
16% годовых по вкладам со сроком хранения 18, 24 и 36 месяцев.
- открытым до 17.08.2016 – процентная ставка при фактическом ежедневном остатке вклада до 2000,00 рублей (включительно) в размере:
14% годовых по вкладам со сроком хранения 3 месяца;
15% годовых по вкладам со сроком хранения 6 месяцев;
- открытым до 17.08.2016 – процентная ставка при фактическом ежедневном остатке вклада свыше 2000,00 рублей в размере:
14,5% годовых по вкладам со сроком хранения 3 месяца;
15,5% годовых по вкладам со сроком хранения 6 месяцев;
- открытым с 13.11.2015 до 01.04.2016 – процентная ставка при фактическом ежедневном остатке вклада до 2000,00 рублей (включительно) в размере:
15,5% годовых по вкладам со сроком хранения 12 месяцев;
- открытым с 13.11.2015 до 01.04.2016 процентная ставка при фактическом ежедневном остатке вклада свыше 2000,00 рублей в размере:
16% годовых по вкладам со сроком хранения 12 месяцев.

С 17.09.2016 устанавливается по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Интернет-депозит – Презент»**, открытым до 17.08.2016 процентная ставка в размере 15,5% годовых.

С 17.09.2016 устанавливаются по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях, открытым до 17.08.2016, процентные ставки в следующих размерах:
- **«Классик Отзывный до года»**:
на срок 185 дней – 14,5% годовых.
- «Классик Безотзывный до года»:
на срок 6 месяцев – 17% годовых;
на срок 9 месяцев – 18,5% годовых.
- «Классик Безотзывный свыше года»:
на срок 18 месяцев – 20% годовых;
на срок 24 месяца – 20,5% годовых.
- «Свободный выбор»:
на срок 11 месяцев – 18,5% годовых;
на срок 24 месяца – 20,5% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

С 17.09.2016 устанавливаются по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях, открытым до 17.08.2016, процентные ставки в следующих размерах:
- **«Классик Почтовый Отзывный»** – 16% годовых.
- **«Классик Почтовый Безотзывный»** – 20,5% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100325912.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

■ На слыху

ПУШЧАНСКІ ЗУБР КІРУЕЦЦА ВА УКРАІНУ?

У Кобрынскім раёне ўжо два тыдні блукае адзінокі зубр. Яго бачылі на тэрыторыі гаспадарак «Астромічы», «Стрыгава», «Гарадзец-Агра». Начуе звер, як правіла, у лесе, а днём выходзіць пахарчавацца, а таксама падыходзіць блізка да статкаў кароў.

Паводле апошняй інфармацыі, зубр рухаецца на поўдзень. У мінулыя выхадныя ляснога волата каля вёскі Павіцце бачыла **землеўпарадкавальнік Дзівінскага сельвыканкама Святлана ТРУБЧЫК.**

— Я стаяла за дваццаць метраў ад яго, фатаграфавала на сваю камеру, — расказала Святлана Іванаўна. — Мае аднавяскоўцы выказвалі асцярогу, што звер можа быць шалёны. Але яго паводзіны кажуць пра адваротнае. Ён стаяў і спакойна еў салому, якую нядаўна сабралі ў рулонны цюк. Потым павярнуўся і пайшоў у бок лесу. Расказваюць, што ў іншых мясцовасцях зубр прычыніў шкоду, напрыклад, парваў электрапастух. У нас ён нічога дрэннага не зрабіў. І людзі назіраюць за ім як за экзатычнай жывёлай. А днём раней яго бачылі ў Лелікаве, гэта ўжо на самай мяжы з Украінай. Магчыма, зубр сабраўся туды.

Намеснік начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Сяргей ШТЫК сказаў, што не варта падыходзіць да зубра на адлегласць 20 метраў. Лепей усё ж не спакушацца на цікавае сэлфі, а адагнаць звера моцнымі гукамі, падыдзе сігнал аўтамабіля. Гэта дзікі звер, нельга прадбачыць, што яму прыйдзе ў галаву. У зубра, па ўсёй верагоднасці, гон — ён блукае ў пошуках новага месца жыхарства. Вядома, што пушча перанаселеная зубрамі. І некаторыя асобіны сыходзяць у іншыя мясцовасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*